**Вілейка С.Л.,**
*аспірант кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

# МУЗЫКА Ў ЖЫЦЦІ АРМІІ І ЎМОВЫ ЯЕ ЭФЕКТЫЎНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ Ў ВЫХАВАННІ ВАЙСКОЎЦАЎ

Сярод разнастайных відаў мастацтва адно з цэнтральных месцаў у жыцці сучаснага чалавека займае музыка. Гэта абумоўлена, па-першае, тым, што ў цяперашні час імкліва развіваюцца сродкі масавай інфармацыі, а таксама разнастайныя тэхнічныя сродкі гуказапісу, дзякуючы якім актыўна распаўсюджваюцца ў грамадстве творы музычнага мастацтва. Па-другое, як паказваюць вынікі шэрагу сацыялагічных даследаванняў, значная частка маладых людзей ва ўзросце 16—20 гадоў з усіх відаў мастацтва аддае перавагу музыцы і часцей за ўсё менавіта праслухоўванню музычных твораў прысвячае свой вольны час. У поўнай меры гэта можна сказаць і пра армію, паколькі значная частка вайскоўцаў — моладзь.

Ваенная гісторыя пераканаўча паказвае, што поспех у баявых дзеяннях "в конечном счёте обусловлен состоянием духа тех масс, которые на поле брани проливают свою кровь" (Ленин В.И. Полное собрание сочинений.— Т.41.— С.121).

Асабліва вялікае значэнне ў баявых умовах набываюць такія якасці, як патрыятызм, вернасць воінскаму абавязку, непарушная ўпэўненасць у сваіх сілах. Неабходна адзначыць, што на фарміраванне і актуалізацыю такіх якасцей вельмі эфектыўнае ўздзеянне зможа аказаць мастацтва, і ў прыватнасці музыка.

Гэтую асаблівасць высока ацаніў яшчэ А.В.Сувораў, які казаў, што музыка ў баі "патрэбная і карысная" таму, што яна "падвойвае, патройвае армію".

Не выпадкова ў гады грамадзянскай вайны распараджэннем Рэўваенсавета ў войсках былі створаны (у якасці асобных падраздзяленняў) чырвонаармейскія хары і ўведзена абавязковае навучанне асабовага саставу харавым спевам. А ў верасні 1941 года, у вельмі цяжкі час, Галоўнае палітычнае ўпраўленне РСЧА накіравала ў палітаддзелы дзеючай арміі ліст, у якім патрабавала актывізаваць работу па прапагандзе баявых чырвонаармейскіх, патрыятычных песень, разглядаючы гэтую работу як састаўную частку палітычнага выхавання асабовага складу.

Вялікае значэнне чалавечы фактар мае і ў сучаснай вайне, калі маральна-псіхалагічны стан асабовага саставу можа адыграць рашаючую ролю ў зыходзе бою. І тут мастацкія сродкі (і ў першую чаргу музыка) здольныя аказаць незаменную дапамогу ва ўмацаванні псіхалагічнай устойлівасці воінаў (праз стварэнне перад боем неабходнага псіхалагічнага настрою, упэўненасці ў сваіх сілах), у барацьбе са станамі страху, прыгнечанасці, у зняцці нервовага напружання пасля бою.

Музыка атрымлівае ўсё большае распаўсюджванне і ў штодзённым жыцці і дзейнасці сучаснай арміі. Вайскоўцы сістэматычна зведваюць на сабе ўплыў музыкі, у прыватнасці падчас прагляду і праслухоўвання праграм тэлебачання і радыёвяшчання. Запісаная на магнітафонную стужку, грампласцінку, кампакт-дыск музыка ўсё часцей знаходзіць сваё месца ў правядзенні розных выхаваўчых, культурна-масавых, спартыўных мерапрыемстваў, прыцягвае ўвагу воінаў у вольны час.

Неабходна разгледзець шэраг істотных умоў, ад якіх залежыць поспех работы па выкарыстанні музыкі ў баявой дзейнасці войскаў, у працэсе выхавання.

Варта сказаць пра кампетэнтнасць тых асоб, якія арганізуюць і праводзяць такую работу. Толькі асабістае далучэнне да багацця музычнай культуры, пэўнае веданне спецыфікі музыкі, правільнае ўяўленне аб асноўных сродках, напрамках і формах выкарыстання музычнага

мастацтва ў выхаванні воінаў могуць дазволіць належным чынам арганізаваць прымяненне музыкі ў выхаваўчай рабоце. На жаль, нямала афіцэраў сёння не маюць амаль ніякіх сістэматычных ведаў у галіне тэорыі і гісторыі музыкі, а таксама ў пытаннях прапаганды твораў гэтага віду мастацтва. Таму вельмі важнае значэнне набывае вывучэнне курсантамі ваеннай акадэміі курса “Культуралогія”. Шмат што залежыць і ад самаадукацыі афіцэра ў сферы музычнай культуры, якая можа ажыццяўляцца шляхам вывучэння спецыяльнай літаратуры, наведвання канцэртаў, прагляду тэлеперадач, праслухоўвання розных радыёпраграм.

Адной з важнейшых умоў эфектыўнага прымянення музыкі ў працэсе навучання і выхавання вайскоўцаў з’яўляюцца зацікаўленыя адносіны да гэтага пытання камандзіраў часцей і іх намеснікаў па выхаваўчай рабоце. Як паказвае вопыт, у многіх выпадках асноўнай прычынай неэфектыўнага выкарыстання сродкаў музычнага мастацтва ў выхаваўчай рабоце з’яўляецца недаацэнка выхаваўчага значэння ўсіх відаў мастацтва, у тым ліку і музыкі, недахоп увагі да іх. Зацікаўленыя адносіны павінны праяўляцца перш за ўсё ў тым, каб камандзір часці і яго намеснік па выхаваўчай рабоце ў штодзённай дзейнасці ўсяляк падтрымлівалі і заахвочвалі людзей, якія займаюцца ў часці прапагандай музыкі: музыкантаў ваеннага аркестра, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, аўтараў музычных перадач радыёвузла і інш. Прычым важна не толькі стварыць спрыяльныя ўмовы, але і па магчымасці падкрэсліць сваёй прысутнасцю ці нават удзелам у якім-небудзь мерапрыемстве значнасць той справы, якой яны займаюцца.

Істотнае значэнне для павышэння эфектыўнасці выхавання вайскоўцаў сродкамі музычнага мастацтва мае забеспячэнне іх планамернага і комплекснага выкарыстання. На жаль, у многіх воінскіх часцях цяпер прымяненне музыкі мае эпізадычны характар і звязана з выка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстаннем музычных твораў толькі ў асобных культурна-масавых мерапрыемствах. Сапраўднага ж выхаваўчага эфекту ад прымянення музычных сродкаў можна дасягнуць толькі тады, калі пры планаванні ўсёй выхаваўчай работы ў часці загадзя прадугледжваецца, у якіх мерапрыемствах і як могуць быць выкарыстаны творы мастацтва, у прыватнасці музычныя.

Важнай умовай з'яўляецца забеспячэнне высокага мастацкага ўзроўню праводзімых культурна-масавых мерапрыемстваў. Падыход да адбору і ацэнкі музычных твораў, што выкарыстоўваюцца ў рабоце з воінамі, павінен быць аб'ектыўным, непрадузятым, прынцыповым. Улічваючы складанасць мастацка-эстэтычнага аналізу твораў музычнага мастацтва, асабліва сучаснай музыкі, неабходна актыўна выкарыстоўваць прафесійныя веды ваеннага дырыжора, а таксама спецыялістаў-музыкантаў з ліку сем'яў ваеннаслужачых.

Нельга не адзначыць, што немалаважным з'яўляецца і стварэнне неабходных арганізацыйных і матэрыяльна-бытавых умоў для творчай дзейнасці ваеннага аркестра, калектываў музычнай самадзейнасці. Маюцца на ўвазе, у першую чаргу, падрыхтоўка кваліфікаваных ваенных дырыжораў і ўкамплектаванне аркестраў прафесійна падрыхтаванымі музыкантамі. Раней, пры існаванні Савецкага Саюза, падрыхтоўка ваенных дырыжораў ажыццяўлялася на ваенна-дырыжорскім факультэце пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І.Чайкоўскага. Цяпер Рэспублікі Беларусь давядзецца вырашаць гэтую задачу самастойна. Магчымасці для гэтага ёсць. У Мінску дзейнічаюць дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія валодаюць высокім навучальным і творчым патэнцыялам і цалкам могуць ажыццяўляць падрыхтоўку высокапрафесійных ваенных дырыжораў. Вялікія цяжкасці заўсёды выклікала пытанне ўкамплектавання ваенных аркестраў прафесійна падрыхтаванымі кадрамі ваенных музыкантаў. Гэта адносіцца як да музыкантаў тэрміновай службы, так

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і да музыкантаў звыштэрміноваслужачых (ці кантрактнікаў). Сёння пазначаная праблема ўскладняецца цяжкасцямі з прызывам на абавязковую службу і падзеннем прэстыжу воінскай службы ўвогуле, і таму яе вырашэнне не заўсёды залежыць ад камандзіра часці і яго намесніка па выхаваўчай рабоце.

Неабходныя ўмовы для пастаянных заняткаў павінны быць створаны і ў калектывах музычнай самадзейнасці часці. Перш за ўсё ім неабходна выдзеліць памяшканне, вызначыць час заняткаў, забяспечыць матэрыяльнымі сродкамі. Усё гэта павінна быць вызначана загадам камандзіра часці па арганізацыі мастацкай самадзейнасці.

І, нарэшце, яшчэ адной важнай умовай павышэння эфектыўнасці выкарыстання музыкі ў выхаванні вайскоўцаў выступаюць устанаўленне сувязей з мясцовымі музычнымі творчымі арганізацыямі (калі такая магчымасць ёсць ва ўмовах дыслакацыі воінскай часці) і прыцягненне іх спецыялістаў да шэфскай мастацка-выхаваўчай работы з воінамі. Сярод гэтых арганізацый могуць быць мясцовыя аддзяленні Саюза кампазітараў, абласныя канцэртныя арганізацыі, музычныя навучальныя ўстановы. Акрамя таго, істотную дапамогу ў арганізацыі работы па музычнай асвеце і выхаванні воінаў могуць аказаць абласныя ўпраўленні культуры, раённыя аддзелы культуры, Дамы культуры, а таксама навукова-метадычныя і метадычныя цэнтры.

У былым СССР актыўна праводзілася ваенна-шэфская мастацкая работа, якая ажыццяўлялася створанымі пры саветах прафсаюзаў работнікаў культуры і творчых саюзах ваенна-шэфскімі камісіямі. Гэтыя камісіі сумесна з паліторганамі вырашалі пытанні накіравання ў войска з канцэртамі дзеячаў культуры і мастацтва, мастацка-канцэртных брыгад. Сёння такія камісіі існуюць практычна толькі на паперы, і таму аднаўленне іх актыўнай работы садзейнічала б павышэнню эфектыўнасці выкарыстання музыкі ў выхаваўчым працэсе.